

*ЮРКАБАЕНА*

*ЮРКА БАЕНА*

# ЛІСТЫ БЛАКІТНЫХ УСПАМІНАЎ

Бельск-Падляшскі 1991

*Спадару Алесю Лашуку з Лондана*
*за дапамогу ў выданні маёй першай кніжкі*
*шчыра дзякую*

*Аўтар*

# I. НА СВІТАННІ ДНЯ

## ЗЯМЛЯ ТЫ МАЯ

Зямля ты мая —
яблыня пеўчая і залатая,
карміліца,
апякунка мая
і мільёнаў дзяцей сваіх.

Падымаюся
па прыступках лесвіцы,
каб дасягнуць плада —
твайго жыватворнага яблыка.

# МАЛІТВА ДА БЕЛАВЕЖЫ

Стройная блакітнавокая Славянка
Белавежы залатавалосая Пані
нябачная з бяздонняў пушчы
куды ляцяць жураўліныя чароды
з тугой за пажыўным дыханнем
і сакрэтнага свету пейзажам

Уладарка зялёных брам і блакіту
каралева веж белых у небе
акрытых стагоддзямі зім і вёсен
абнятых плячыма імглы таемнай
і звонкай цішынёю глыбокай
царства дрымучага моваю

Адгароджаная святымі дзвярыма
і спрадвечнай сцяной непраходнай
прынясі па дрыжачых жураўліных струнах
найцішэйшы стукат зямлі і сэрца кнеі
бессмяротную паэзію іх задуменнасці
о! Белавежы магутнай Пані



# У ВІШНЁВЫМ САДЗЕ

У вішнёвым садзе —
маладосці гаю,
над шумлівай рэчкай,
рэчкаю нястрымнай,
што нясе ўдалеч
воды серабрыстыя,
зацвілі зноў вішні.

Бель іскрыцца онегам
на галінках вішняў
і пяе на сонцы
маладосці спевам,
і цалуе вечна
валасы красуняў
цёплым пацалункам.

Нектар вабіць пчолы,
што гудуць бясконца
у паводцы белі,
у каронах вішняў.
А гудуць дзяўчыне,
што цалуе кветкі
і салодка марыць.

Марыць аб каханні
чыстым як пах вішняў,
як вішнёвы нектар,
як вада ў рэчцы.
Марыць аб спатканнях
над шумлівай рэчкай
у вішнёвым садзе.

*   *   *

У канцы лета
Вандроўная птушка
Удаль адлятае,
Удаль... удаль... удаль...
Яшчэ кружыцца
Над роднай сялібай,
Нівай і лугам,
Над звілістай рэчкай,
Пабледлай на сонцы
У летняй спякоце.
Яшчэ купаецца
У цёплым блакіце
Вераснёвага неба...
А ўжо развітваецца
З роднай вёскай і рэчкай,
Нівай і лугам,
З родным небам.
І ляціць
Удаль... удаль... удаль...
І гіне
У бяздонні неба,
Нязнанага неба,
Чужога неба.



# АГАРОДНІК

Садзіць і садзіць
Агароднік ружы,
Без канца, нястрымна
У спякоты,сцюжы.

Садзіць і садзіць
Пад небам імглістым
На прасторы дзікім,
На зямлі скалістай.

Садзіць і верыць:
На зямлі скалістай
Загарацца ружы
Сонцам прамяністым.

# МАРЫ АБ РУЖЫ

Зямля скалістая
маці ўбогая
жалобная чэрнь
зямнога цвету

Ты днём і ноччу
марыш аб ружы
аб неўміручай ружы
адным толькі зярняці

І днём і ноччу
над табою маці
плач траў нясецца
з бяздомным ветрам

І днём і ноччу
за хлеб штодзённы
за хлеб-ратунак
травы моляцца

Зямля скалістая
маці ўбогая
чым ты накорміш
дзяцей паўмёртвых

І днём гарачым
і халоднай ноччу
перад дзвярыма ветру
просіш хлеба

І днём і ноччу
марыш аб ружы
аб неўміручай ружы
адным толькі зярняці.



# ШАНУЙЦЕ ЛАНДЫШ

Шануйце ландыш
у цяні расцвіты
ля пня яліны
што праменні крые
што трасе іголкі
на лісточкі кветкі
белыя званочкі
вочкі серабрыстыя

Шануйце ландыш
у цяні расцвіты.

# ЧЫРВОНЫЯ ЯБЛЫКІ

Чырвоныя яблыкі
на талерцы
палаюць

Свежасць з іх б'е
агнём поўдня
промняў фантанам

Бляскам дыямента
ззяюць
нерухомыя

чырвоныя яблыкі
на талерцы.

# БЫЎ САД

Быў сад,
у якім кожны плод
цвыркаў як птах
на світанні дня.

І пні дрэў,
як калоны —
старажытных Афінаў цвет.

І галіны,
як вянец блакітнага дня,
іскрыстых звезд.

І лісцё,
як крылы,
што ўзняў птах
на высокі лёт.

Быў сад...



# ГЛЯНЬЦЕ

Гляньце!
Там, пад небам, на вяршыні ўзвышша
Стаіць самотная таполя.
Стаіць як пальма на беразе мора,
Як манумент-статуя
На некранутым фоне неба,
Як маці, што на світанні
Ідзе выглядаць свайго сына,
Як сімвал вечнага чакання —
Маці!..........................

# II. У ІМГЛЕ ПРАДВЕСНЯ

## НА МАЗУРСКІХ АЗЁРАХ

сябру прысвячаю

Калі ў папялішчы неба гаслі зоры,
З тугою за пурпурам, тоні арнаментам,
Пагоняю за сонца іскрай-дыяментам,
Панесла нас абодвух лодкай на азёры.

Досвіткам спяць азёры ў золкай стьгаі.
Застыў і час без цыферблата— незварушна...
Умольвае чаротнік ветру цішай скрушнай
На берагах-парогах соннае святыні.

Устрымліваем веслы... Днее над вадою...
Хвалістай баразною тонь наш след збянтэжыў.
Усплёскі затухаюць... Полагі спакою...

Пейзаж як табу... Явы то, ці сны ў бязмежжы?
Тку сетку з павуціння слыху над зямлёю —
Сябра! Пошум дубоў я чую з Белавежы!



## ЛЕС ТЫ МОЙ, БЕЛАВЕЖСКІ

Лес ты мой, белавежскі, мая ты калыска,
Святло непарушнае ў паводцы вёснаў,
Да цябе ідуць зоры вяршынямі соснаў
Пад рукі мацярынскай адвечную прыстань.

Усе зоры вечарам у небе мільгаюць,
А з крынічнай лютні льецца звонкая песня —
Мая кроў бурліць раннім юнацтвам, прадвеснем;
Узлятаючыя грудзі рукі ўзнімаюць...

Лес ты мой, белавежскі, з табой я — адзінства:
Штодзённым вяртаннем, галубіным успамінам
Глыбока ўваходжу ў край мой — у мацярынства.

А калі сустрэну завеі з парывам,
Прыбягу да цябе я сцяжынкай цяністай,
Засцеражэш ты мяне і прымеш як сына.

*   *   *

Месячным ветразем я плыву па-над лесам,
Лічу зоры старанна на белай фіранцы... —
Сэрцам і каганцом серабрыстай маланкі
Пішу паэмы, з ветрам складаю я п'есы.

Вакол пейзаж пушчы, белавежскай натуры.
Вобраз удзень маляваны радугай, сонцам...
А я іду ў кнею, дзе пугач у акенцы.
Можа знайду і там след прадвесня і буры?

Там румяняцца сосны янтарнай жывіцай
І дуброва гамоніць маладосцю смелай.
Там ад вякоў няспынна б'е сэрца крыніцы.

Там чаромхі квецце, як кірыліца белая,
З папірусам дуба так вясною зрадніцца,
Аж у яднанні ўзыдзе магутная вера.



*   *   *

Ты і я — верныя сабе як пень зрашчэння,
Стаім пад навіссю закрытага прастору,
У вуалі мяцеліцы пад снежным борам,
У абдымках прорвы, ветру, стыхіі гнеўнай.

Яднаюцца тут дзівоснасць і рэчаіснасць.
Гадзіны чакання даўжэюць і дзеляцца.
Зрэнкі свае шырыць белая мяцеліца. —
Міласэрнасць вачэй таямніча зарыцца.

А ў цёмным бары тапырыцца ваўчыха,
Чорны воран старанна мерыць свае шанцы.
Мёрзласць к сэрцам падкрадваецца ціха-ціха...

Пакуль ледзяныя кінемся ў рытм самбы,
Пакуль у сон уступім з усмешкай на тварах,
У пячоры завеі запалім дзве лямпы.

# У ТАКУЮ ЗАМЕЦЬ

Такая замець ноччу ўсе кастры нам гасіць,
Сцяною закрывае тлеючыя вочы...
Мядзведзь са сну сарваўся і ўжо так крочыць,
Быццам аслеп раптоўна і дарог не бачыць.

З якара сарваныя кажаны і цемры,
У шумным трапятанні ўсе ляцяць наўкола;
Мёрзласць — ліхаманка трасе на нас калоссе...
Ліпкай цвіллю ў горле ржавее крык дарэмны...

У такую замець агонь трэба нам крэсіць,
Хоць гадзіна хмурная, а сэрцы ў ранах...
— У снягі глыбокія я ўступаю першы!... —

Аж пад неба вырасце падснежнік з маланак,
Аж зацвітуць зноў макі золакам гарэўшым,
Аж блакітам узыдзе над дарогай ранак.



# У ГЛЫБІНІ НОЧЫ

У глыбіні ночы сон такі мне прысніўся,
Што за сёмай гарою, за сёмай ракою,
За імглою прадвесняў, за снежнай зімою
Пад купалам зорным я з табою спыніўся.

Сыплючы іней-іскры з каганца спакою,
Зрэнак яснай усмешкай і позіркам першым
Ты запаліла свечкі і лямпы ў сэрцы. —
Запалымнела каханне світання царквою.

У жнівеньскім садзе ў балдахіне зялёным
Колерам лета сочныя яблыкі спелі. —
І плады-рубіны прынясла ты ў далонях.

Нашыя грудзі кастрамі поўдня гарэлі,
А валасы хвалявалі ў яркам пагоні, —
У глыбіні ночы на дне лютай завеі...

*   *   *

Як бразганне ў манатоннасці нястрымнай,
Дзень учарашні сёння непрыкметна гасне.
Чорнай ночы аб'явіць казялец няшчасце,
Сухі трэсне ядловец, накрыецца дымам.

За сабою час пакідае папялішчы,
Хоць чырванню агеньчык тлее да змяркання.
Заусёды мы стаім на вечных скрыжаваннях,
А кожная хвіліна, як момант урачысты.

...Дарог не знаем. А ідзем праз сенажаці.
Бягуць нам на сустрэчу, адплываюць воды.
У вачах прага й смеласць, і страх юначы...

Ноч за днём, год за днямі, новы стыль і моды.
І лёгка так згубіцца, каб не сэрца маці. —
Яно днём і ноччу чэрціць карту пагоды.

# У НАЧНЫМ ПОЕЗДЗЕ

У начным поездзе
з адкінутымі галовамі
апушчанымі рукамі
адкрытымі ратамі
усе мы хутка засынаем

Пасля доўгага падарожжа
у начным поездзе
прачынаемся
і пытаем дзе мы.



# МАЯ ПРЫСУТНАСЦЬ І ЧАС

Прысутны я,
Хоць часта амаль няма мяне.

Час уцякае паміж пальцамі,
Між адным і другім дыханнем,
Між адным і другім позіркам,
Між кароткім бліскам думкі.

Яшчэ гэтыя словы пішу ўпарта
На гарызонтах жоўкнучай паперы,
Яшчэ бяссонніцай ратуюся ўночы,
А раніцай устаю як па крушэнні...

Вучуся быць прысутным я.
І знаю: астануся невылечна хворы,
Бо час — няўмольны пераможац.

А усё-такі прысутны я
І не крычу з працягнутай рукою:
— Час, мілы мой, падай мне руку!...

# III. ТАЯ РАКА

*   *   *

Наш дом.
У доме мама. Цёпла. Ціха.

Акно. На падаконніку, як сонца,
чырванее герань.

За акном снягі,
на дрэвах іней
і гурбы ля парога.

А ў свет бяжыць
іскрыстая
дарога...



*   *   *

У хаце шчасця і дзяцінства
Заўсёды сніцца сон
Вялікі аб дарозе;
Шуміць прадвесне,
У лодцы родзіцца надзея.

А на лугах зялёных
Кветкі, як зоры зацвітаюць —
Бушуе май.

У бацькоўскім садзе вецер
Варушыць яблыні вяршыняй,
Пахне сонцам і берагам далёкім...

Не плач, каліна,
Чырванню крывавай,
Бо толькі пыл дарожны
Павісне над лугамі.

А толькі той затужыць
За роднаю страхою,
Хто ластаўкай у небе,
Якое бураю трывожыць.

## ТАЯ РАКА

Тая рака з усіх найдаражэйшая,
Якая бяжыць ля хат, крыніцы першай.

Рашыў за ёй ісці я ўперад, крочыць,
А яна бяльмом мне засланіла вочы...

# ЗІМОВАЯ ДАРОГА Ў ВЁСКУ

З поўначы снежань са снегам прышоў,
Студзень на вокнах аставіў узор,
Люты ўпарта мяце ды мяце. —
У заносах гарадское шасэ.

Свежы снег упаў зноў учора,
Шалеў буран — сапраўднае гора!
А мне да сям'і спешна ў вёску.
Хоць пабачу, на момант ускочу...

Зараз думка прабегла праз розум,
Што не выедзе сёння аўтобус.
Бягу на вакзал, там інфармуюць:
Поезд не пойдзе, мост рамантуюць.

І што тут рабіць?... Іду пехатой.
Вецер сляды закідае за мной.
Згінаецца-згінаецца хвоя,
Я ў гурбах ныраю па пояс.

Рукі мерзнуць... Няма мне спакою.
Сэрца ў грудзях трапечацца з болю,
Трэці дзень горла раніць ангіна...
Дзе ж дарога? Дзе след, каляіна?

Пытаю сябе, чаму ў гміне
Не даюць на дарогі машыны?
Гавары ты хоць з д'яблам, зрадніся,
Чорту руку падай, пакланіся.



Так іду тры-чатыры гадзіны,
За мной сунецца змрок ад даліны.
Вось і вёска ляжыць на вяршыне.
Там у хатах святло ўключылі...

Але тут паднімаецца замець,
Клубіцца снег, вачыма не глянеш.
Тут завея тапырыцца злая
Вые і вые, як воўчая зграя.

Вось і апошні агеньчык пагас.
Я крычу... Заўтра абскарджу я вас,
Начальнік, ваявода, міністры.
Я ж у вёсцы пакінуў дзяцінства!...

# ВЯСНА 1986 ГОДА Ў МОКРЫМ

Вясною ў Мокрым смутак ходзіць вуліцай.
У садах, самотных хатах спіць мяцеліца,
Забытае гняздо буслінае на ветры
Тапырыцца. Мінулае к жыццю не вернецца.

Хтосьці старэнькі перад іконой моліцца,
А шэпт ягоны з белым месяцам вандруе.
Вялікае каханне тут не народзіцца —
Шчэбету дзіцячага ўжо больш не пачуеш.

Вясна ў Мокрым — жалобная элегія:
Памяць аб памёршых па могільніку крочыць.
Сярод крыжоў людскія твары пастарэлыя,
Сярод глыбокіх задуменняў плач жаночы...

А колькі было тут сонца, а колькі гульняў,
Сустрэч і расставанняў, і вечароў зорных,
Колькі руплівасці, турбот і неспакою,
Простых гутарак, мудрых слоў і думак гордых...

Бывай цяпло дзяцінства, матчын позірк, радасць,
Бывай таполя, сад і першае каханне —
Час пакрывае вас журбою лістапада.
Вітай мой смутак, жаль і сэрца трапятанне...



# РОДНЫ ДОМ

На ўзбярэжжы свету між вятроў
Свой родны дом я восенню пакінуў.
Цяпер у думках, песнях, вершах
Еду туды, да блізкіх сэрцу ніў,
Да хаты, дзе ў шпалерах дрэў
Заўжды птушыны чую спеў.
Іду туды, дзе будзіцца прадвесне
Каля крыніцы звонкай, студні першай...

Толькі вось ноччу маці ў снах
Лісты трывожныя ўсё піша,
Што быццам вокны абняла мятліца,
Што ў лузе высахла крыніца,
Што над старонкай роднай змоўклі песні,
А камень увайшоў глыбока ў сэрца!...

* * *

Высокія клёны
З майго дзяцінства
Застылі ў задуменнях,
Акамянелі ў соннай,
Звонкай, спеўнай
Цішыні вячэрняй.

У вырай адляцелі
Ластаўкі, што ў надхмар'
Вочы ўсе ўзнімалі. —
Цяпер толькі ўжо зрэнкі
Звужаюцца ад стомы...

А кругагляд?
А кругагляд мой цэлы
Засланілі словы,
Словы, словы
Беласнежнай мовы...



* * *

У срэбнай,
Быццам снежны пыл хусціне,
Цераз луг блакітных успамінаў
Ад родных ніў,
Вясковай хаты
Ідзе ўстрывожаная маці.

Нішто, мама, ужо нішто
Нам дрэннае не здарыцца,
Хаця пакінуты твае дарогі
І памяць у пажары.

Шчаслівa ў горадзе жывем,
Наўскраі...
Таму не злуй,
Што пра цябе
Мы проста забываем.

# СЛАНЕЧНІК

У гэтым доме
На парозе смутак прысеў.
Выехалі дзеці ў свет.
Ніхто пісьмаў
Маці не піша.
У пустым полі даўно
Пачарнелі іржышчы.
Там адзінокі, халодны
Крочыць кастрычнік.

Яшчэ калі сад
Стаіць у імгле,
Матуля свой дзень пачынае.
Раннім вечарам
Гасіць у хаце святло,
Хаця доўга ўначы
Глядзіць праз акно —
Усё чакае, чакае...

Ажно ранкам устае,
Ідзе да акенца:
— Сланечнік цвіце! Сланечнік цвіце!
Зараз у хаце святлей,
Зараз у хаце ярчэй,
Весялей і цяплей...



# ПІЛІГРЫМЫ

Прыведзеныя ў роспач
з апусцелых сёл
нібы з-за свету
вяртаюцца

угледжаныя наперад
і ўзвышаныя

пілігрымы
з канца XX стагоддзя.

# ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ПРАПАЎШЫМ

Дваццаць гадоў таму назад
З сяла Глухое Ніжняе
Выйшаў малады мужчына
І дагэтуль не вярнуўся.

Трэба спадзявацца,
Што хварэе стратай памяці.
Змяніў імя і прозвішча
І напэўна — мову.

Калі хто-небудзь чуў аб ім,
Калі хто-небудзь яго бачыў
Ці знае пра месцапрабыванне,
Просім, каб зараз, неадкладна
Паведаміў старога бацьку,
Які чакае сына.

Як цяпер завуць прапаўшага?
— Не ведаем.
Здымка з апісаннем выгляду
— Не маем.
Падазравайце кожнага.



# ЕЗДАКІ

Сяджу я за сталом
І стомленым зрокам
Гляджу ў акенца.

А там па дарозе
Мчыцца белая конніца
Мінулых стагоддзяў.

Раптам бачу: Усе ездакі
Спынілі коней,
Ідуць будучыні насустрач...

# СОРАМ

Тады найболып саромейся, Еўропа,
Калі зара надзеі гасне,
А песні звонкія народа
Ідуць у катакумбы часу,
Калі ў развалінах старога дома
Матчына яшчэ стукоча слова —
Так дагарае мова!...

# СУАЙЧЫННІКАМ

Калі з уласнай волі
хто-небудзь з суайчыннікаў
адправіцца далёка на чужыну,
хай сцеражэ як зрэнкаў
зярняткі пяску
з зямлі айчыннай,
якія асталіся
на падэшвах ботаў.

У дні трывогі,
а мо і паніжэння,
бяздушнасці, пагарды,
яшчэ будуць яны іскрыцца,
як пыл крыштальны
і як алмазы.



* * *

Пасля вялікага падарожжа
З маленькай буры
Супакой прыходзіць.
Знясіленая звярына
Да крыніц вяртаецца,
Аслабленая птушка
Да гнязда спяшаецца...

Пакланіся і ты
Сваёй крыніцы,
Калысцы, быццам арцы...

І Слову,
Якое дало табе імя
І ГОНАР ЧАЛАВЕКАМ ЗВАЦЦА!

# ПАКАЗАЛЬНІК ДАРОГ

Усім,
хто толькі мяне
пытае пра дарогі,
паказваю шляхі,
напрамкі ў падарожжы.

Толькі чаму
зноў астаюся я ў снягах,
сярод вятроў ці спёкі,
як вартавы на раздарожжы,
сумны такі
і адзінокі?



# ХВІЛІНА

Кожная хвіліна ў час зеніту
Як арнамент на небасхіле вісіць,
Расхістаная ў спякоце лета
І ў шумных светлаценях поўдня.

У цеплыні блакітнай неба
Час напінае свае струны.
Над імі казяльцы зырчэюць,
Пад імі застаецца бездань.

Хвіліна, як спелы адуванчык,
Увысь аслупянелая ўзлятае
Ці апускаецца без подыху,
Празрыстымі фіранкамі закрыта.

— Іскра! іскра! іскра! —
Крычу я быццам на ратунак.
— Іскра? іскра? іскра? —
Сябе пытаю ціха.

Да глыбіны ядра ўжо астывае,
Дрыготкая і папялістая,
З крат непрыкметна падае ў прорву—
Касой адкінула яе камета.

Потым хвіліна — нібы ціша,
Нібы ў гербарыі засушана былінка:
Перад вачыма яшчэ раз узнікне
Заўтра, у ранішніх газетах.

## РАКА

Калі ўжо горад спіць
а з ім палова зямнога шара
адчыняю акно

Шэра-залаты прастор
у пакой уваходзіць
як сонны стэп

А там у ветразях таполі
звініць ціша
А там на палях моста
павісла неба

І толькі рака
шуміць нібы артэрыя
на заспаным поўным целе

І толькі рака быццам канал
злучае ночы з днямі
бяжыць уперад смела
пульсам аддзяліўшыся
ад вечнага маўчання цемнаты



## ПАСЛЯ РЫБАЛКІ

Пасля рыбалкі два рыбакі-пенсіянеры
Паклалі ўлоў і вуды, пагутарыць прыселі.

У начной імгле пачаў золак разгарацца;
Рыбакі ў світанне — як у прошлае — ўглядацца...

Дзень устаў. Зноў шастае, трашчыць лазіна. —
А рака нясе, нясе ўспаміны...

* * *

Залатой восенню
стаіць бяроза ў кастрах.

На другім беразе
усё цішэй ды цішэй
шалясціць лісцё.

У сіняве настальгіі
дрэмле тапор часу.

Дарожка мая,
аддаляецца пачатак.
Усё бліжэй ды бліжэй
да канца.

# ДУМКА

Прадуманую думку
у кішэнь хаваю
за пазуху адкладваю

спатрэбіцца

быццам сухар
у час нястачы
быццам абутак
у басаногія гады.

# ЛАД

Душэўны лад,
нібы збан,
напоўнены світаннем,
шматколерны,
крыштальны.

Аты —
хто тады?
Можа той коннік,
што плыве ў даліну
з подыхам прадвесня,
як шчыры друг
або як горны
правансальскі вецер?



# ЭДЭЛЬВЕЙС

Эдэльвейс, як зорка, павіснуў у небе:
З аднаго боку граніт, з другога — прорва,
А гарызонт, як сон,
К даліне хіліцца.

Эх! падумайце: Халодныя вятры
Не раз будзілі ў калысцы.
Убогая зямля скалістая —
Маці яго, карміліца.

А ён? Ну што ж,
Кветка гордая, прыгожая,
Смела ўгору к сонцу ўецца,
Цэлая праменнямі абнятая,
Уся ў ясных захапленнях.

Эдэльвейс! зара пад небам!
Аб табе ўсё сняцца сны,
З табой яднаюся я сэрцам.

І яшчэ здаецца мне,
Што ў штодзённасці, у жыцці
Часта іду тваім я следам.

# ЖЫЦЦЁ І ВЕРА

Такое ўжо наша жыццё —
Уцякае з кожным подыхам ветру,
Быццам сон пералётнай птушкі.

Мы, як на мяжы,
Жывем між вопытам мінулага
І верай у будучыню.

Вера ў тым дубе,
Што пасадзіў я вясной ля дарогі —
Можа дасць адпор бурам?

Вера ў кароткіх радках,
У шэрым камені выразаных
Мо існаваць будуць вечна?...

Вера ў тых словах,
Кірыліцай на паперы пісаных. —
Заўжды хай жывуць у народзе
І ў яго бібліятэках!



# КЛІЧНІК І ПЫТАЛЬНІК

Калі ўпершыню,
Быццам клічнік
На пурпурным фоне неба,
Вітаў я чараду
Жураўлёў над хатай,

Адтуль у сэрцы
Нашу пытальнік:
Ці тугу птушыную
Ураўнаважыць любоў мая
І маё сумленне?...

# СВЯТЫНЯ

„белавежцам"

Гаворым на многіх мовах Еўропы,
Усімі сродкамі людской прысутнасці.
Гаворым голасам,
рэхам,
смехам,
Лавінай снежнай,
шумам траў,
рэк і вадаспадаў,
Бнкам сірэн,
машын
і тэлефонным звонам.

Толькі ў Пушчы маўчым мы.
У Белавежы нашай,
Святыні нашай!...



* * *

Вялікая частка таго,
Што найбольш кахаў я ў жыцці,
Адплыла ў лодках прамінання.
Асталіся, аднак,
Рукапісы мінулага,
Шолах учарашніх крокаў...

Цяпер з маленькім сынам
На беразе ракі
Будуем судна —
Каўчэг для Памяці.

# БААБАБ

А калі ўжо будзе трэба
баабабам я астануся
зберагу глыбока пад карою
тысячагоддзяў памяць
захаваю сэрца і карэнні
і дажджавой парою
сваім пальчастым лістам
вітаць я буду адраджэнне.